# ШЛЯХ

БЮЛЕТЭНЬ БЕРАСЬЦЕЙСКІХ РЭГІЯНАЛЬНЫХ РАД БНФ «АДРАДЖЭНЬНЕ»

ВЫДАЕЦЦА З САКАВІКА 1989 ГОДА

4-5. 1989
ЛІСТАПАД
СЬНЕЖАНЬ

## БЕРАСЬЦЕЙСКІЯ ДЗЯДЫ-89

Газета "Заря" надрукавала І лістапада матэрыял Канавалюка "Поминовение... у ресторана" прысьвечаны правядзеньню ў Берасьці абрада памяці памёрлых Дзяды. 2 сьнежня "Заря" ізноў вярнулася да гэтай тэмы, апублікаваўшы адзін ліст чытача, з тых, што прыйшлі ў рэдакцыю, і таксама тлумачэньні адказных асоб і "новыя меркаваньні" Канавалюка.

Рэдакцыя "Шляху" вырашыла пазнаёміць чытачоў з адным з водгукаў на публікацыю ад І лістапада, які "Заря" не адважылася надрукаваць, і адказ на яго старшыні Рады БНФ Р.Бакіевіча:

● ● ●

Абласному аддзьдзяленьню СП БССР; Брэсцкай Радзе БНФ "Адраджэньне"; Грамадзка-культурнай суполцы "Край"; Копіі: гарвыканкам, Вянцалю Б.І.; газета "Заря".

Дарагія землякі! Шчыра Вам дзякую за праведзены вамі абрад паміналньня памяці продкаў — Дзяды, 28 кастрычніка 1989 года у Брэсьце. Ваша ўшанаваньне памяці продкаў — яно і па маіх бацьках, замардаваных фашыстамі на берасьцейскай зямлі. Нізкі паклон мой зямлі, у якой яны ляжаць, нізкі паклон вам, дарагія землякі, за вашы сьвятыя сьвечкі.

Пасылаю 230 рублёў /на адрас аддзьдзяленьня СП БССР у г.Брэсьце/ на выплату штрафу, прысуджанага М.Пракаповічу і Р.Бакіевічу за высакародную акцыю, сапраўдная цана якой не вымяраецца грашыма, бо ваша акцыя бясцэнная сваім гуманістычным духам і зьместам. А грошы? — гэта хай будзе і маёй выплатай за ганьбу, якую гарадскія ўлады пакрылі сябе, падрасаваўшы нагамі магілы нашых продкаў, і якая таксама грашыма не вымерваецца, а толькі пагардай.

Р. Хай Гасподзь БОГ даруе айцу Яўгенію ягоны грэх "подобострастия" перад уладамі: Праваслаўная Царква асьвяціла Крыж "невинно убиенным" у Курапатах і адслужыла жалобную паніхіду.

г.Менск, член СП БССР, член Сойму БНФ "Адраджэньне", Васіль СЕМУХА.

Шаноўны Васіль Сяргеевіч! Да глыбіні душы кранула Ваша падтрымка /матэрыяльная і маральная/, Ваша слова еднасьці з намі, Ваша асуджэньне несправядлівасьці, якую твораць берасьцейскія ўлады.

Дзяды, якія мы ўпершыню за многія дзесяцігодзьдзі адзначылі ў Берасьці, гэта шчырае ўсьведамленьне неабходнасьці вярнуцца да вытокаў народнай маралі, у якой належнае месца павінна займаць памяць і павага да продкаў, якія ва ўсе стагодзьдзі гінулі за вольнасьць сваю ці станавіліся "невинно убиенными". У Беларусі можна на кожным метры зямлі запаліць сьвечку і не памыліцца — уся наша зямля паліта крывёю людскою. І нам прыемна, што Вы зразумелі гэта. Улады імкнуліся абвінаваціць нас у палітыканстве, у

Працяг на ст.7

## КРОНІКА

Берасьце, 7 ЛІСТАПАДА. Пры правядзеньні дэманстрацыі прысьвечанай 72 гадавіне Кастрычніцкага перавароту /Рэвалюцыяй яго пачалі называць толькі з 1921 года/ дэманстранты несьлі ня толькі лозунгі са стандартнымі словамі, але і адзін зь незацьверджаным тэкстам. Праўда, службоўцы МУС і служкі партапарату не далі пранесьці гэты транспарант ля трыбун зь мясцовай наменклатурай.

Берасьце, 9,10,15,20 ЛІСТАПАДА. У гэтыя дні праходзілі суды над арганізатарамі і ўдзельнікамі абрада памяці памёрлых — Дзяды. Вынікі судоў — штрафы і папярэджаньні /гл.ст.7/.

Берасьце, 3 СЬНЕЖНЯ. Адбыўся першы у горадзе мітынг "У падтрымку перабудовы: галоснасьць, дэмакратызацыя, сацыяльная справядлівасьць, сацыялізм!". На мітынгу прыняты ўхвалы /рэзалюцыі/ з патрабаваньнямі рэгістрацыі БНФ "Адраджэньне", з асуджэньнем наменклатурных прывілеяў і падвышэньня акладаў адміністрацыйнаму апарату і г.д.

Працяг на ст.2

## БУДАЎНІКІ "СВЕТЛАЙ" БУДУЧЫНІ

30 верасьня 1989 года група кіраўнікоў сельскай гаспадаркі і меліярацыі, абмеркаваўшы пытаньне аб магчымасьці правядзеньня меліярацыйных работ у калгасе "Заря" Столінскага раёна, прыняла рашэньне, у якім 5-ым пунктам запісана:

"Столинскому райисполкому осуществить финансирование проектных и мелиоративных работ за счет средств, выделенных району на ликвидацию последствий Чернобыльской аварии. Протокол решения подписали:

ШЕВЧУК П.В. – председатель Столинского РАПО;
ЛИСОВЕЦ Н.С. – зам.председателя колхоза "Заря";
ВЕЧЕРКО Н.И. – главный агроном колхоза "Заря";
ЛЕОНОВЕЦ Т.Ф. – председатель профкома к-за "Заря";
ЛУКАШИК П.И. – начальник Брестского "Облводхоза";
ДАНИЛОВИЧ Г.В. – управляющ.трестом "Пинскводстрой";
СЕРКОВ М.М. – гл.инж.инст. "Полесьегипроводхоз";
ПОДДУБНЫЙ Н.Я. – директор Пинской ОДСПиО."

Зацьвердзіў пратакол старшыня Брэсцкага аблвыканкама БУРСКІ В.І.

Як бачым, сродкі, якія выдзелены Столінскаму раёну, каб хоць як паменшыць уплыў радыёнуклідаў на здароўе людзей, выкарыстоўваюцца на чарговы ўдар па прыродзе Палесься. Значную частку грошай выдаткавалі на будаўніцтва гароднінасховішча ў аграфірме імя Леніна "Бережное".

Становіцца зразумелым, чаму у Рэспубліцы так мала зроблена для выратаваньня нацыі ад Чарнобыльскай бяды. Але тых, хто вінаваты ў гэтым, мы дружна вылучаем у народныя дэпутаты СССР і таксама дружна аддаем за іх свае галасы.

г.Пінск, Пятрусь РАКАЎСКІ

Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond 1/11 sprava Ш70

## УВАГА

Дапаўняем інфармацыю пра напісаньне і вымаўленьне гукаў З, С, Ц, ДЗ у беларускай мове.

У верасьнёўскім нумары "Шляху" /№2/ мы зьвярталі вашую ўвагу, што названыя гукі вымаўляюцца мякка перад мяккімі, але не дадалі, што памякчэньня не адбываецца і мяккі знак ня пішацца перад мяккімі Г, К, Х. Напрыклад — згінуць, скінуць, схінуцца.

## КУДЫ ПАДЗЕЎСЯ ФАКТ З ГІСТОРЫІ?

Афіцыйнай гісторыяй усяляк замоўчваецца падзея 1363 года у раёне сярэдняга цячэньня ракі Паўднёвы Буг. Робіцца гэта, відаць, з мэтай не дапусьціць росту нацыянальнай сьвядомасьці беларусаў і, адпаведна, узвысіць ролю рускіх у барацьбе супраць мангола-татараў /Они вас всех защитили.../.

У 1363, за 17 гадоў да Кулікоўскай бітвы, якая зараз падаецца як збаўленьне і Вялікага княства Літоўскага і народаў Заходняй Еўропы ад Арды, вялікі князь Альгерд, сын Гедыміна, арганізаваў паход супраць ардынцаў і ў бітве, вядомай як "бітва ля Сініх Вод", разьбіў мангола-татарскія войскі і іх васалаў.

Менавіта перамога беларуска-літоўскай дзяржавы у вайне з Ардою, у выніку якой да княства былі далучаны раней залежныя ад Арды землі /ад вусьця ракі Серэт да Чорнага мора, басейны Днястра і Паўднёвага Буга, паўднёвае Падняпроўе і Кіеўшчына/, натхніла і маскоўскіх князёў на вайну за уласнае вызваленьне з-пад чужынскага ярма.

Такім чынам, паражэньне мангола-татараў пад час Кулікоўскай бітвы зьявілася усяго толькі працягам справы, распачатай прашчурамі сучасных беларусаў, якія ніколі не чакалі абароны з боку "добрых суседзяў", а баранілі сваю зямлю і свае сьвятыні самі.

г.Пінск, Пятрусь РАКАЎСКІ.

## ДЫЯЛОГ

Зазваніў тэлефон:

— Вам трэба падрыхтаваць выпіску з пратакола прафсаюзнай канферэнцыі, характарыстыку, асабісты лісток па уліку кадраў, аўтабіяграфію і фотаздымкі.

— А нашто гэта? — пытаюся, даведаўшыся хто гэта звоніць.

— Вас павінны зацьвярджаць на бюро райкама партыі.

— Але, прабачце, я да вашай арганізацыі не прыналежу.

— Не, — не згаджаецца жаночы голас з тэлефоннай трубкі, — усе вызваленыя старшыні прафкамаў — гэта раённая наменклатура і павінны зацьвярджацца на бюро райкама партыі.

"Нічога сабе, — думаю, — для іх слова "наменклатура" усё яшчэ нешта як само сабе зразумелае", — таму пярэчу:

— Мяне выбраў працоўны калектыў і тым зацьвердзіў. Дык чаму і хто мяне павінен яшчэ раз зацьвярджаць?

— Вам неабходна прыехаць у райкам, — не суцішаецца голас на другім канцы, — у панядзелак або ў аўторак, каб з вамі пазнаёміліся яшчэ да бюро.

— І ў гэтым няма патрэбы, бо ў райкаме мяне вельмі добра ведаюць...

Гудкі з трубкі... Сяджу ў роздуме. І па нявопытнасьці шкадую, што не згуляў ролю да канца і не пацікавіўся да якога магазіна мяне павінны прымацаваць як "раённую наменклатуру".

г.Белаазёрск, Сяргей АМЯЛЬЧУК,
старшыня прафкама Белааз. ЭМЗ.

## МЯСЦОВАЕ ГОРА,
## або
## ЯК СУСТРАКАЎ ЯФРЭМ ЯГОРА

В.Ж. /1989г./

Калі к Яфрэму пад'язджаў Ягор,
Як першы падхалім, Яфрэм страчаў яго.
Ен пашыраў і "прасаваў" катком дарогу,
Бардзюры, броўкі лоўка фарбаваў,
Хоць дождж і фарбу ўсю змываў, —
Пашчыраваць прыйшлося многа!..
— А ў чым, — спытаеце, — прычына?
— Ягор вышэйшы за Яфрэма чынам!
Але абое,
Так сказаць,
Рабое...

ж ж ж

Наведаў зноў Ягор Яфрэма,
Каб неяк падбадзёрыцца ў яго:
Прадстаўнікі застойнае сістэмы
Ня могуць жыць адзін без аднаго.
На гэты раз перад Ягорам
Дастаткам зіхатнуў яфрэмаў горад,
Хоць гэта й быў дастатак паказны
/за ім стаяў падман скразны/,
Бо разнастайныя каўбасы,
Вяндліна, шынка, ананасы
У крамах толькі тых былі,
Куды заезджага вялі
/У крамах тых, заўжды пустых,
Дастатак існаваў адзіны міг/.
Пра гэта ведаў і Ягор,
Ды хітрая гульня здаволіла яго —
Расхвальваць так пачаў Яфрэма,
Што гэта — самастойная ўжо тэма.

Кіруюць, нам на гора,
яфрэмы і ягоры.
Датуль на нашых карках ім сядзець,
Дакуль мы будзем іх цярпець.

## НАШ СЛОЎНІК

ДЕМАГОГЪ м.греч. крайній демократъ, добивающійся власти во имя народа; тайный возмутитель; поборникъ безначалія, желающій ниспровергнуть порядокъ управленія. Демагогія ж. господство власти народа, черни въ управленіи; народовластіе. Демагогскій, демагогичный или демагогическій, къ убъжденіямъ и стремленію сему относящійся.

Владимиръ Даль "Толковый словарь живого великорусского языка" т.I. Государственное издательство иностранных и национальных словарей, Москва, 1956.

### ЗАЯВА ЧЫТАЧОЎ У РЭДАКЦЫЮ "ШЛЯХА"

Таварыш Салакоў на сустрэчы з выбаршчыкамі, якая адбылася ў Доме культуры, запэўніў, што завод БВК, які зьбіраюцца будаваць паблізу, будзе экалагічна чыстым на ўсе сто працэнтаў.

Ставім свае ўмовы: адразу ж за трохкіламетровай санітарнай зонай у абавязковым парадку /і лепш за дзяржаўны кошт — так хутчэй/ пабудаваць дачу і катэгарычна загадаць таварышу Салакову ўвесь вольны ад работы час праводзіць менавіта на дачным участку.

### ЗДАРАЕЦЦА І ТАКОЕ!

У звычайнай чарзе звычайнага магазіна за звычайнымі прадуктамі харчаваньня былі апазнаны першы сакратар гаркама, старшыня гарвыканкама, дырэктар нарыхтоўчай канторы, старшыня райспажывсаюза і іншыя мясцовыя кіраўнікі. Як высьветлілі журналісты, якія правялі незалежнае рассьледваньне, сьпецразьмеркавальнік зараз на рамонце.

У Кавярдзяках запісаў К.ПЯСЧАНКІН.

ШЛЯХ 4-5.89

Нумар падрыхтавалі: Мікола Пракаповіч /рэдактар/, Уладзімір Базан, Валянціна Мароз. Адрас для карэспандэнцыі: 224000 г.Брэст, паштамт, а/с 31; тэлефон для паведамленьняў: 6-51-35.

Меркаваньні аўтараў апублікаваных матэрыялаў не абавязкова супадаюць зь меркаваньнямі рэдакцыі, Рэгіянальных Рад БНФ і Соймам БНФ "Адраджэньне". Нагадваем, што бяз Вашых ахвяраваньняў выданьне "Шляху" стане немагчымым. Фармат — 1/2 друкаванага аркуша. Друкарня пана Марціна Кухты. Наклад — 3000.